■ Усё, што вы хацелі ведаць...

МІФЫ ПРА САБАК

Сёлета пад Баранавічамі пітбуль напаў на цяжарную жанчыну — у выніку пацярпелай давялося ампутаваць абедзве рукі. Некалькі гадоў назад стафардшырскі тэр'ер загрыз пяцімесячную дзяўчынку. У Мінску шчанюк хаскі адгрыз руку васьмімесячнаму дзіцяці. Трагічныя выпадкі з удзелам чатырохногіх сяброў чалавека здараюцца ўсё часцей. У выніку адны пачынаюць баяцца любых вялікіх сабак, якіх бачаць на вуліцы. Іншыя заступаюцца за сабак, вінавацячы безадказных гаспадароў. Пра галоўныя міфы аб чатырохногіх сябрах чалавека расказвае інструктар-кінолаг Андрэй ШКЛЯЕЎ.

Міф 1. Сабакі-забойцы?

Скажу адразу — генетычных сабак-забойцаў у прыродзе не бывае! Як правіла, чалавек набывае сабаку канкрэтнай пароды, папярэдне не вывучыўшы гісторыю яе з'яўлення, мэту стварэння пароды, асаблівасці паводзінаў. У працэсе вырошчвання шчаняці ўласнік можа не ўдзяляць патрэбнай увагі яго выхаванню і дапускаць памылкі ў выхаванні і ўтрыманні. На жаль, сёння сустракаецца даволі шмат безадказных уласнікаў сабак, якія мала ведаюць аб кіналагічнай і агульначалавечай культуры. Магу сказаць дакладна: вынікам няправільнага абыходжання чалавека з сабакам любой пароды стане як мінімум няшчасны выпадак, ад якога могуць пацярпець іншыя гаспадары сабак, іх выхаванцы і іншыя людзі. Сабака не нараджаецца забойцам іншых сабак альбо чалавека. Гэтаму спрыяе маса фактараў: схільнасць жывёлы да праяўлення агрэсіі, няздольнасць уласніка ўплываць на яго паводзіны, парушэнні ў псіхіцы сабакі і гаспадара, адсутнасць выхавання і адукацыйных заняткаў з выхаванцам, няправільныя ўмовы яго вырошчвання, утрымання. Усе байкі пра сабак-забойцаў нараджаюцца з-за таго, што людзі часта ачалавечваюць жывёл альбо, наадварот, ставяцца да іх як да неадушаўлёных механізмаў.

Міф 2. Пра небяспечнасць байцовых парод

Што такое байцовая парода? Гэта парода, якая выводзілася для ўдзелу ў сабачых баях. Калі ўважліва пачытаць гісторыю ўзнікнення і развіцця многіх парод, выявіцца, што толькі для ўдзелу ў баях сабак ніхто практычна не выводзіў. Сабачыя баі прыйшлі пазней. Многія «булі» і тэр'еры (з рознымі прыстаўкамі і абрэвіятурамі ў назвах) першапачаткова выводзіліся як паляўнічыя сабакі і толькі праз некаторы час сталі выкарыстоўвацца ў «баявых дзеяннях». Яны мусілі спыніць буйнога звера (напрыклад, дзіка) і ўтрымаць яго да падыходу паляўнічых. Натуральна, па прыродзе такім сабакам неабходна здольнасць самастойнага прыняцця рашэнняў і пэўная незалежнасць у паводзінах. Менавіта гэтыя якасці ў далейшым прывялі да таго, што такіх сабак сталі выкарыстоўваць на рынгах.

Да байцовых сабак часта адносяць тоса-іну, філа бразілейра і аргенцінскіх догаў. Гэтыя пароды ствараліся для аховы, таму яны таксама здольны працаваць аўтаномна, не азіраючыся на гаспадара: менавіта гэтая якасць была ўзята на ўзбраенне аматарамі сабачых баёў. Тым не менш многія пароды сабак, прадстаўнікі якіх прымаюць удзел у такіх баях, да байцовых не адносяцца, напрыклад, сярэднеазіяцкая аўчарка. Няма адзінага меркавання аб тым, якіх сабак лічыць байцовымі. У ЗША да іх адносяць доберман-пінчараў і ратвейлераў, у некаторых краінах Еўропы — паўднёваафрыканскага бурбуля. У Англіі ў падпольных сабачых баях прымалі ўдзел скотчтэр'еры і фокстэр'еры, але чамусьці ніхто не залічвае іх да байцовых. Верагодна, у працэсе падрыхтоўкі сабак да баёў чалавек праводзіў спецыяльны адбор, у выніку чаго рэзка вырасла агрэсіўнасць асобных прадстаўнікоў розных парод. Аднак гэтая якасць падвяргалася вельмі жорсткаму кантролю: агрэсіўнасць да іншых сабак заахвочвалася, а тыя асобіны, якія дэманстравалі яе ў адносінах да чалавека, адбракоўваліся (бо менавіта людзі разнімаюць сабак на рынгу і аглядаюць іх перад боем, таму жывёла павінна даць чалавеку магчымасць дакрануцца да сябе). А цяпер успомнім сучасных пекінесаў і балонак — ці дазваляюць яны зрабіць такое і застацца без пакарання? Можа і іх назавём байцовымі? Усе міфы аб агрэсіўнасці байцовых сабак да чалавека ўзнікаюць, як правіла, пры сустрэчах з асобнымі прадстаўнікамі розных парод, якія з'явіліся ў выніку непрафесіянальнага развядзення, няправільна ўтрымліваліся, выхоўваліся (а можа, і ўвогуле не выхоўваліся).

Міф 3. Пра сабак-наркаманаў

Кажуць, што сабак, якія займаюцца пошукамі наркотыкаў, для больш эфектыўнай работы літаральна накачваюць наркатычнымі рэчывамі. Уявіце сабе, колькі такі сабака можа пражыць і што за гэты час адбудзецца з яго арганізмам? Як хутка і дакладна сабака будзе рэагаваць на каманды ўласніка па-за сваёй «рабочай» пошукавай дзейнасцю? Прафесіяналы ў працэсе падрыхтоўкі сабак да пошуку наркатычных рэчываў выкарыстоўваюць шэраг спецыяльных методык, ні адна з якіх не дапускае ўжывання наркотыкаў у якасці заахвочвання ці стымулявання сабакі. Больш чым за 30 гадоў работы з сабакамі я ні разу не сутыкаўся з праявай «сабачай наркаманіі».

Міф 4. Пра сабак-нянек

Правільна выхаваны сабака не праявіць агрэсіі да дзіцяці ні пры якіх умовах, якія б дзеянні ў дачыненні да яе той ні рабіў. Такія якасці ўласцівы практычна любой пародзе сабак. Але вопытны сабакавод заўжды папярэдзіць, што лепш не пакідаць сабаку з маленькімі дзецьмі без нагляду! Існуе міф, што сабака... ніколі не кране дзіця. Для любога сабакі дзіця — гэта перш за ўсё «шчаня». Але дзеці не могуць рабіць тыя ж позы і дзеянні шчанюкоў, а сабака з першага разу не можа разабрацца, хто перад ім.

Як сабака выхоўвае шчанят? Каб малы зразумеў, што ім незадаволены, маці гыркае, калі шчаня не слухаецца — хапае за карак і трасе альбо проста прыкусвае. Яна не наносіць траўм шчаняці, хоць яно пры гэтым можа скавытаць і вішчаць. А што, калі сабака вырашыць так зрабіць з дзіцем?

Сабака не пусціць малога ў небяспечнае месца? Хоць некаторыя сабакі сапраўды перакрываюць шлях малым дзецям, гэта не гарантуе абароны ад магчымай небяспекі. Для абароны малога сабака мусіць уяўляць сабе, дзе можа знаходзіцца крыніца небяспекі. І ў кватэры, і на вуліцы існуе маса месцаў, спалучаных з рызыкай для дзіцяці, якія сабака наўрад ці адчуе і ўспрыме як небяспечныя. Сабака не можа быць адэкватным вартаўніком для дзіцяці.

Сабака можа бяспечна гуляць з малым? Сабакі бываюць розныя. Уявіце сабе асобіну буйной пароды, якая падчас гульні незнарок зачэпіць яго ці вырашыць скокнуць, а пасля гулліва прыкусіць. У лепшым выпадку дзіцяці будзе непрыемна. У сваю чаргу, сабаку можа раздражняць назойлівая ўвага, якая выражаецца ў спробах пакалупацца ў носе, патузаць за хвост. Але ў большасці выпадкаў сабака з'яўляецца клапатлівым і адданым сябрам для дзіцяці, калі ён добра выхаваны, а гаспадары ў момант яго гульні з малым знаходзяцца побач.

Андрэй ШКЛЯЕЎ,
Інструктар-кінолаг

■ У свеце жывёл

САМЫ МАЛЕНЬКІ АЛЕНЬ,

ці Што ўяўляе сабой казуля

Вытанчаная і грацыёзная, гэта жывёла не мае сабе роўных сярод іншых капытных. Яна з'яўляецца сапраўдным упрыгажэннем беларускіх лясоў.

Часцей за ўсё еўрапейская казуля насяляе мяшаныя лясы, якія распаўсюджаны каля адкрытых прастораў. Падчас адпачынку яна трымаецца на ўзлесках, палянах, лугах, у поймах рэк.

Казуля — самы маленькі прадстаўнік беларускіх відаў сямейства аленевых. Сваім стройным і лёгкім складам цела з адносна кароткім тулавам яна крышку нагадвае казу. Пярэднія і заднія ногі тонкія і доўгія, нібы вытачаныя ўмелым майстрам. Яны робяць жывёлу здольнай да хуткіх і спрытных перасоўванняў. Даўжыня скачка звычайна 1,5-2, але можа дасягаць і 6 метраў!

Адбіткі капытоў казулі адрозніваюцца ад слядоў лася і аленя невялікімі памерамі, а ад маладых кабаноў — больш прамымі абрысамі. На цвёрдым грунце застаюцца адбіткі капытоў толькі сярэдніх пальцаў. На мяккай зямлі і снезе прыкметныя і адбіткі бакавых пальцаў, размешчаных вышэй. Звычайна казулі перасоўваюцца, ставячы заднія ногі ў сляды пярэдніх. Пры гэтым адбіткі капытоў размешчаны ўздоўж прамой лініі. Узімку добра прыкметныя іх «копанкі» — месцы, дзе казулі ўзрываюць капытамі снег у пошуках корму.

Галаву самцоў казулі ўпрыгожваюць невялікія, але сімпатычныя рожкі. Рогі гэтыя ліпрападобныя і ўсаджаны мноствам касцяных шышачак-«жамчужын». На канцах рожак звычайна мудрагеліста расстаўлены тры атожылкі. Штогод у кастрычніку-снежні рогі скідаюцца, а ўвесну вырастаюць ізноў.

Ёсць у казулі і сваё «люстэрка». Так называюць светлую пляму, якая рэзка вылучаецца каля хваста жывёлы. Яна дапамагае членам аднаго статка зрокава мець зносіны паміж сабой і рухацца адзін за адным нават у густым лесе і ў цемры. У стане спалоху «люстэрка» павялічваецца больш чым у два разы. Мільгаючы наперадзе, яно служыць сігналам небяспекі для тых членаў сям'і, што знаходзяцца побач, і, галоўнае, для безабаронных маленькіх казулянят.

У прыплодзе казулі бывае звычайна два, радзей тры дзіцяняці. Казуляняты нараджаюцца ў маі-чэрвені і здаюцца зусім бездапаможнымі. Першыя два тыдні жыцця малеча маларухомая, яны больш ляжаць, паднімаючыся толькі для кармлення. А ўжо з двухтыднёвага ўзросту дзіцяняты не адстаюць ад маці. Кормяцца яе малаком да ліпеня-жніўня, потым пачынаюць есці сакавітае лісце і траву. Нованароджаныя казляняты пакрытыя мяккай рудой шэрсткай з некалькімі шэрагамі светлых плям. Такая характэрная ахоўная афарбоўка валасянога покрыва захоўваецца да канца лета. Яна дапамагае дзіцянятам добра маскіравацца, каб засцерагчыся ад небяспечных драпежнікаў. А натуральных ворагаў у іх у гэты перыяд шмат: ваўкі, рысі, лісы, бадзяжныя сабакі.

Нягледзячы на тое, што казуля цяжка пераносіць суровыя зімы і з'яўляецца адносна лёгкай здабычай шматлікіх драпежнікаў, за апошнія 20 гадоў яе колькасць толькі ў Бярэзінскім біясферным запаведніку вырасла амаль у два разы і цяпер складае больш за сотню асобін.

Анастасія РЫЖКОВА

■ Зялёная аптэка

ГРЫБЫ — ЦАРСТВА ЦУДАЎ

У прыродзе існуе больш за 80 000 відаў грыбоў. Сярод іх ёсць усімі вядомыя шапачкавыя грыбы, напрыклад баравік ці чырвоны мухамор, а таксама грыбкі, дрожджы, цвілі. Апошнія растуць на харчовых прадуктах і выклікаюць захворванні раслін, чалавека і жывёл. Мы ж спынімся на некаторых карысных для чалавека грыбах, якія размнажаюцца спорамі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Грыбы рэзка адрозніваюцца ад раслін тым, што не ўтрымліваюць хларафілу, сілкуюцца за кошт гатовых арганічных рэчываў.

У лясах яны з'яўляюцца не адначасова. Адны грыбы растуць увесну (смаржкі, страчкі), іншыя — улетку (падбярозавікі, белыя, маслякі, ваўнянкі, сыраежкі), трэція — увосень (апенькі, зялёнкі, радоўкі).

У розных краінах ужываюць у ежу каля 100 відаў грыбоў, а ў некаторых мясцовасцях — не больш за 15-20. У Беларусі расце каля 200 відаў ядомых грыбоў, а ў кошык трапляюць толькі 40 з іх.

Пытанне пра ядомасць ці атрутнасць у былыя часы вырашалася толькі вопытным шляхам, а сёння да гэтага пытання далучылася і навука, якая, ведаючы хімічны састаў грыбоў, падказвае людзям, як выкарыстоўваць іх у якасці ежы і лекаў.

Ядомыя грыбы ўтрымліваюць вялікую колькасць бялкоў, вітамінаў (A, B, C, D, PP), мікраэлементаў (калій, фосфар, серу, цынк, жалеза, кальцый, магній), вуглеводы, тлушчы і іншыя біялагічна актыўныя рэчывы.

У шматлікіх краінах існуюць курсы па навучанні грыбнікоў, дзе тлумачаць, у які час лепш збіраць грыбы, як іх зразаць і складаць у кошык, перавозіць на транспарце і г.д. Напрыклад, для збору грыбоў нельга выкарыстоўваць вёдры, поліэтыленавыя мяшкі і іншыя ёмістасці, якія перакрываюць доступ паветра да грыбоў. Свежасабраныя грыбы пры тэмпературы +10...+18 °С нельга захоўваць больш за 4-8 гадзін. Рэкамендуецца збіраць грыбы, калі яны ўжо выраслі, але яшчэ не састарэлі. Каштоўнасць «дзядкоў» змяншаецца амаль у два разы.

Ядомыя грыбы вараць, смажаць, тушаць, соляць, марынуюць. Аднак больш бяспечна і карысна для здароўя ўжываць сушаныя грыбы ў выглядзе дробнага парашка, які можна дадаваць у прыправы, соусы, падліўкі. Дробныя часціцы лягчэй пераварваюцца і засвойваюцца арганізмам.

Трошкі пра лісічкі. Яны каштоўныя тым, што ніколі не бываюць чарвівымі, іх не аб'ядаюць грыбныя мухі, яны менш за іншыя грыбы крышацца, ломяцца, працяглы час захоўваюцца ў свежым выглядзе і амаль не ўбіраюць радыенукліды.

Лісічкі ўтрымліваюць рэдкую ў прыродзе янтарную кіслату, вельмі карысную пры лячэнні сардэчна-сасудзістых захворванняў і для амаладжэння ўсяго арганізма. Яны павышаюць імунітэт.

У 1976 годзе кардыёлаг, доктар медыцынскіх навук Якаў Шпірт пісаў, што калі гэту кіслату прымаць сумесна з муміё, то можна пражыць «колькі захочаш гадоў». Яна валодае адной з вельмі важных уласцівасцяў — сама знаходзіць у арганізме тыя ўчасткі цела, якія ў ёй маюць патрэбу, абыходзячы здаровыя.

У лісічках маецца і рэдкае біялагічна актыўнае рэчыва, здольнае забіваць розныя віды паразітаў. Сябе грыбы абараняюць ад гнілі і чарвякоў, а чалавека — ад глістоў, а таксама ад іх лічынак.

Настойка. Заліваюць 0,5 л свежых здробненых грыбоў (ці 1 шклянка сухіх) 0,5 л гарэлкі, вытрымліваюць 3-4 тыдні ў шкляным, шчыльна зачыненым посудзе ў цёмным месцы, перыядычна ўзбоўтваючы. Прымаюць па 1 ч. лыжцы (запіваючы вадой) перад сном ці з'ядаюць па 1 дэсертнай лыжцы гэтых грыбоў. Так робяць, пакуль не скончыцца ўся прыгатаваная настойка. Праз 4-5 месяцаў курс лячэння паўтараюць.

У народнай медыцыне настойка з лісічак ужываецца пры лячэнні анкалагічных захворванняў.

Лідзія НАВІЧЫХІНА,
травазнаўца-лекар